*ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!*

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

1980 г.
6 ЛІСТАПАДА
ЧАЦВЕР
№ 29 (1293)
Выходзіць раз у тыдзень.
Цана 2 кап.

**СЛАВА ВЯЛІКАМУ КАСТРЫЧНІКУ, ЯКІ АДКРЫЎ НОВУЮ ЭПОХУ Ў ГІСТОРЫІ ЧАЛАВЕЦТВА!**

*(З заклікаў ЦК КПСС да 63-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай Сацыялістычнай рэвалюцыі).*




## ПАД ЛЕНІНСКІМ СЦЯГАМ

НАД НАШАЙ НЕАБСЯЖНАЙ РАДЗІМАЙ лунаюць чырвоныя сцягі. Заўтра на вуліцы і плошчы гарадоў і вёсак выйдуць мільёны савецкіх людзей, каб прадэманстраваць сваю адданасць справе Вялікага Кастрычніка, выказаць бязмежную любоў да роднай Камуністычнай партыі, якая ленінскім курсам вядзе наш народ ад перамогі да перамогі.

Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі споўнілася шэсцьдзесят тры гады. Шэсцьдзесят тры гады новай эры — эры рэвалюцыйнага абнаўлення свету, усталявання камуністычных ідэалаў. І мы па праву ганарымся, што гэту эру адкрыла наша краіна, што яна першая ў свеце разбіла ланцугі рабства і прыгнёту, паказала ўсяму чалавецтву шлях да свабоды і шчасця.

Для гісторыі шэсцьдзесят тры гады — тэрмін невялікі. Але яны па сваёй значнасці, па маштабах здзейсненага, па небываламу ўзлёту эканомікі, навукі, культуры роўныя стагоддзям. Гэта яскрава бачна на прыкладзе нашага універсітэта, якому хутка споўніцца шэсць дзесяцігоддзяў. БДУператварыўся у буйнейшы вучэбны і навуковы цэнтр краіны, яго з гонарам называюць флагманам вышэйшай адукацыі Беларусі. Намаганнямі амаль 25-тысячнага калектыву універсітэт штодня падымаецца на новыя вышыні.

Сённяшні росквіт БДУ стаў магчымы дзякуючы перамозе Вялікага Кастрычніка. І заўтра на дэманстрацыі выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты універсітэта, як і ўсе савецкія людзі, будуць рапартаваць Вялікаму Кастрычніку. Рапартаваць аб тым, што зроблена і што думаюць зрабіць; выкажуць сваё шчырае жаданне працаваць і вучыцца яшчэ лепш, каб з гонарам выканаць вялікія і адказныя заданні, якія вызначыў XXV з'езд КПСС.

Лунаюць чырвоныя сцягі над нашай краінай. Сцягі Вялікага Кастрычніка. Лунаюць сцягі на ўсёй планеце. Разам з намі ўрачыста адзначаюць свята працоўныя ўсяго свету, усё прагрэсіўнае чалавецтва.

Свята Вялікага Кастрычніка Краіна Саветаў адзначае ў абстаноўцы велізарнага палітычнага і працоўнага ўздыму, выкліканага ўсенародным размахам сацыялістычнага спаборніцтва за дастойную сустрэчу XXVI з'езда КПСС.

Вялікі Кастрычнік, Ленін, Камуністычная партыя, Радзіма. Гэтыя словы для кожнага савецкага чалавека непадзельныя. У іх мы бачым сваё шчасце. У імя партыі і Радзімы, справядлівасці і міру на зямлі, якія гарантуе ўсім народам свету Вялікі Кастрычнік, жыве і працуе савецкі чалавек. Самаадданая праца кожнага з нас прасякнута гарачым імкненнем ажыццявіць гістарычныя прадвызначэнні партыі — зарука далейшага дынамічнага развіцця краіны.

— Няхай жыве Вялікі Кастрычнік! Няхай жыве Краіна Саветаў — надзейны гарант міру, сацыяльнай справядлівасці і прагрэсу ўсіх народаў свету.

Са святам, паважаныя таварышы!

РЭКТАРАТ
ПАРТКОМ
МЯСЦКОМ
КАМІТЭТ КАМСАМОЛА
ПРАФКОМ




### ЦІКАВА І ЗМЯСТОЎНА

прайшоў у інтэрнаце № 6 «Агеньчык», прысвечаны 63-й гадавіне Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Акрамя ўрачыстай часткі, у яго праграме быў конкурс на лепшае выкананне песні, танца, праведзена займальная віктарына. Арганізавалі «Агеньчык» студэнты кафедры агульнага праграміравання факультэта прыкладной матэматыкі.

А. ВАЛАТО,
студэнт журфака.

### УРАЧЫСТЫМ ВЕЧАРАМ

закончыўся на геаграфічным факультэце тыдзень Ленінскіх чытанняў, прысвечаны 63-й гадавіне Вялікага Кастрычніка. Студэнты-географы выпусцілі святочны нумар насценнай газеты, афармілі ленінскі пакой і чытальную залу ў інтэрнаце, арганізавалі сустрэчы з ветэранамі партыі і працы.

Г. РЫЛЮК,
сакратар партыйнай арганізацыі геафака.

### НАРОДНЫ ТЭАТР

сярод самадзейных калектываў універсітэта выдзяляецца сваёй арыгінальнасцю. У перадсвяточныя дні адбылася прэм'ера спектакля па п'есе А. Валодзіна «Дзве стралы». Яго паставілі рэжысёр В. Анісенка і рэжысёр-пастаноўшчык Д. Тыцюк.

Вялікая фізічная аўдыторыя, часова ператвораная ў тэатральную залу, не змагла ўмясціць усіх жадаючых паглядзець спектакль. Прэм'ера стала святам не толькі для гледачоў, але і для самадзейных артыстаў.

Пасля спектакля адбылося абмеркаванне новай работы тэатра, ішла размова аб творчых задумах калектыву.

А. ГЕРМАНОВІЧ,
студэнт журфака.

### НА ХІМФАКУ

адбылося пасяджэнне партыйнага бюро. На ім зацверджаны мерапрыемствы, накіраваныя на дастойную сустрэчу свята Кастрычніка. На факультэце аформлены маляўнічы стэнд «Ідэі Леніна жывуць і перамагаюць», на якім паказаны жыццёвы шлях і рэвалюцыйная дзейнасць правадыра сусветнага пралетарыяту.

Л. АЎСЯНКА,
сакратар партыйнай арганізацыі хімфака.



## Заўтра свята!

ТОЛЬКІ ФАКТ

# ПІЧЭТАЎСКІЯ ЧЫТАННІ

НА ГІСТАРЫЧНЫМ ФАКУЛЬТЭЦЕ становіцца традыцыяй падводзіць вынікі навуковых даследаванняў і вызначаць перспектывы будучай работы вучоных на Пічэтаўскіх чытаннях. Яны названы ў гонар першага рэктара нашага універсітэта, выдатнага гісторыка-славіста акадэміка Уладзіміра Іванавіча Пічэты.

Цяперашнія чытанні адбыліся ў канцы кастрычніка і былі прысвечаны вынікам пяцігадовага плана навуковых даследаванняў. Ва ўступным слове дэкан факультэта прафесар І. В. Царук паведаміла, што за пяць гадоў супрацоўнікамі факультэта выдадзена 22 манаграфіі, шэраг навуковых зборнікаў і дапаможнікаў, каля 300 артыкулаў аб'ёмам звыш 600 друкаваных аркушаў. Зроблены добры задзел на будучую пяцігодку. У друку знаходзяцца і выйдуць у 1981 годзе 5 манаграфій, 2 падручнікі, новыя артыкулы.

Усяго былі заслуханы 22 даклады. Сярод выступаўшых — дактары навук, прафесары А. П. Ігнаценка, Г. М. Ліўшыц, Д. Б. Мельцар, Р. М. Трухноў, В. У. Чапко, Л. М. Шнеерсон. Актыўна ўдзельнічалі ў рабоце канферэнцыі аспіранты.

Чарговыя Пічэтаўскія чытанні паказалі, што калектыў гістарычнага факультэта паспяхова завяршае заданні дзесятай пяцігодкі і гатовы дастойна сустрэць XXVI з'езд КПСС і XXIX з'езд КПБ.

У. СОСНА.



НА ЗДЫМКУ: ідзе лекцыя. (Мехмат, 3 курс). Фота М. БЯСЦВІЦКАГА.

# ПРЫКМЕТНЫЯ ЗРУХІ

ВЫКОНВАЕМ ПАСТАНОВУ СХОДУ ПАРТЫЙНАГА АКТЫВУ

ПАРТЫЙНАЕ БЮРО вылічальнага цэнтра сумесна з адміністрацыяй, прафсаюзнай і камсамольскай арганізацыямі распрацавала комплексныя мерапрыемствы на 1980—1981 гг. па рэалізацыі пастановы сходу партыйнага актыву універсітэта. Яны былі абмеркаваны і адобраны на адкрытым партыйным сходзе. Прадугледжваецца значнае паляпшэнне навукова-даследчай работы, павышэнне яе эфектыўнасці. Толькі па дзяржбюджэтнай тэматыцы намечана атрымаць эканамічны эфект ад укаранення ў вытворчасць навуковых распрацовак у суме 209 тысяч рублёў. Ужо ўкаранёны распрацоўкі па аўтаматызаванай сістэме пабудовы тэстаў на двух прадпрыемствах з эканамічным эфектам 59 тысяч рублёў. Ад укаранення распрацовак гасдагаворных тэм на прадпрыемствах рэспублікі мяркуецца атрымаць эканамічны эфект звыш 125 тысяч рублёў. Мерапрыемствы прадугледжваюць якасны рост навукова-педагагічных кадраў, уключаючы прадстаўленне да абароны 6 кандыдацкіх дысертацый.

Супрацоўнікамі ВЦ ужо здадзена ў друк 18 навуковых артыкулаў. Рыхтуюцца да выдання рукапісы чатырох кніг.

Расшырана навукова-тэхнічнае супрацоўніцтва ВЦ з калектывамі навукова-даследчых інстытутаў АН БССР, акадэмічнымі ВНУ і прадпрыемствамі рэспублікі.

У мерапрыемствах вылічальнага цэнтра значнае месца адведзена пашырэнню работ па распрацоўцы, укараненню і ўдасканаленню эксплуатацыі комплексу «АСК БДУ», што павысіць узровень кіравання вучэбна-навуковай і фінансава-гаспадарчай дзейнасцю універсітэта. У перыяд прыёмнай кампаніі ў гэтым годзе больш паспяхова і якасна функцыяніравала падсістэма «Прыём у БДУ». Падсістэма ў поўным аб'ёме забяспечвала апрацоўку інфармацыі аб ходзе паступлення заяў абітурыентаў і здачы экзаменаў, аб залічэнні і выдачы неабходнай справаздачнасці.

Вылічальным цэнтрам распрацаваны чатыры задачы па аўтаматызаванай сістэме кіравання БДУ: улік асноўных сродкаў, улік матэрыялаў, улік дэпаніраваных сум, улік касавых аперацый. У цяперашні час прыступілі да іх вопытнай эксплуатацыі. Укараненне гэтых задач ва універсітэце ўмацуе кантроль за рацыянальным выкарыстаннем матэрыяльных і грашовых рэсурсаў, будзе садзейнічаць павышэнню эфектыўнасці эканамічнага кіравання.

Паляпшэнне навукова-даследчай і вучэбна-вытворчай работы і павышэнне іх узроўню і эфектыўнасці праводзіцца ў арганічным адзінстве з удасканаленнем форм і метадаў ідэйна-выхаваўчай работы, якую праводзіць партыйная арганізацыя ВЦ.

Рыхтуючы дастойную сустрэчу XXVI з'езду КПСС, калектыў ВЦ накіраваў свае намаганні на датэрміновае выкананне плана навукова-даследчай работы 1980 года і мерапрыемстваў па рэалізацыі пастановы сходу партыйнага актыву універсітэта.

А. ЗАХАРАНКА,
сакратар партбюро вылічальнага цэнтра.



Цяжкае ўраўненне. На дошцы канешне, усё атрымаецца. Тым больш, што і выкладчык сочыць. Але трэба знайсці правільнае рашэнне самім...

НА ЗДЫМКУ: заняткі ў 10-й групе III курса механіка-матэматычнага факультэта праводзіць асістэнт В. А. Савянкоў.

Фота М. БЯСЦВІЦКАГА.

НАСУСТРАЧ XXVI З'ЕЗДУ КПСС

# СТРАТЭГІЯ

АМАЛЬ ЗА ПАЎСТАГОДДЗЕ свайго існавання хімічны факультэт рашыў вялікую колькасць ключавых задач, якія вызначылі развіццё хімічнай навукі і прамысловасці рэспублікі. Да ліку такіх задач трэба, у першую чаргу, аднесці забеспячэнне АН БССР і іншых устаноў рэспублікі кваліфікаванымі кадрамі хімікаў, а таксама стварэнне большасці навуковых напрамкаў і школ.

Неабходнасць падрыхтоўкі для рэспублікі хімікаў рознага профілю абумовіла вялікую разнастайнасць навуковых напрамкаў, якія развіваюцца на хімічным факультэце. Плённая навукова-педагагічная дзейнасць калектыву факультэта дазволіла да сярэдзіны 70-х гадоў забяспечыць практычна ўсе гэтыя напрамкі навуковымі кадрамі вышэйшай кваліфікацыі. Даследаванні, якія выконваліся ў гэты час хімікамі БДУ імя У. І. Леніна, былі накіраваны на стварэнне навуковых асноў новых прамыслова-тэхнічных працэсаў і матэрыялаў.

Аднак выкарыстанне даследаванняў у народнай гаспадарцы патрабавала вялікага аб'ёму вопытна-прамысловай праверкі вынікаў НДР, падрыхтоўкі зыходных даных і тэхнічных заданняў для правядзення вопытна-канструктарскіх распрацовак. Натуральна, што калектыў хімічнага факультэта, асноўнай задачай якога была вучэбна-выхаваўчая работа, не мог поўнасцю рашаць гэтыя задачы.

З улікам важнасці выконваемых даследаванняў у 1978 годзе навуковыя падраздзяленні хімічнага факультэта былі рэарганізаваны ў Навукова-даследчы інстытут фізіка-хімічных праблем Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна. Інстытуту ў якасці асноўных зацверджаны два напрамкі навуковай дзейнасці: **даследаванне заканамернасцей хімічнага дзеяння святла на цвёрдыя целы з мэтай стварэння новых матэрыялаў для фотахімічнага запісу інфармацыі і распрацоўка метадаў паляпшэння фізіка-хімічных уласцівасцей цэлюлозы з мэтай стварэння новых прамыслова важных матэрыялаў.**

У інстытуце праведзена рэарганізацыя тэматыкі, аб'яднаны намаганні асобных лабараторый на рашэнні найбольш важных задач. Цяпер побач з двума вышэйназванымі напрамкамі ў НДІ ФХП развіваюцца два наступныя напрамкі: **фізіка-хімічныя асновы матэрыялазнаўства, распрацоўка і даследаванне матэрыялаў для энергетычных канструкцый новай тэхнікі і даследаванне радыяцыйна-хімічных ператварэнняў поліфункцыянальных арганічных злучэнняў, распрацоўка на гэтай аснове працэсаў радыяцыйна-біялагічнай перапрацоўкі цэлюлозы і метадаў ачысткі сцёкавых вод.**

За прайшоўшыя два гады інстытутам атрыманы шэраг цікавых, важных як у навуковых, так і ў практычных адносінах вынікаў. У 1979 годзе супрацоўнікамі інстытута апублікавана 225 артыкулаў, зроблена 145 дакладаў на міжнародных, усесаюзных і рэспубліканскіх канферэнцыях і нарадах, атрымана 28 аўтарскіх пасведчанняў і 21 станоўчае рашэнне на выдачу аўтарскіх пасведчанняў.

Устаноўлены трывалыя творчыя сувязі з вядучымі навуковымі ўстановамі краіны.

**По некаторых навуковых напрамках (напрыклад, у галіне даследавання і распрацоўкі фатаграфічнага працэсу з бессярэбраным фізічным праяўленнем) інстытут з'яўляецца вядучым навуковым калектывам у рэспубліцы і краіне.**

Разам з тым калектыў НДІ ясна разумее, што перад маладым інстытутам стаіць яшчэ шмат нявырашаных праблем, што ў рабоце інстытута маюць месца сур'ёзныя недахопы, якія неабходна ліквідаваць у максімальна сціслыя тэрміны. Асноўны наш недахоп — даўно існуючая на хімічным факультэце і не ліквідаваная да цяперашняга часу ў інстытуце дыспрапорцыя паміж рэзультатыўнасцю фундаментальных даследаванняў і эфектыўнасцю прыкладных работ, выконваемых па іх выніках. З аднаго боку, мы распрацоўваем цікавую і актуальную тэматыку, нашы даследаванні дазволілі атрымаць шмат перспектыўных, важных для практыкі рашэнняў, з другога — тэмпы ўкаранення нашых распрацовак вельмі нізкія і, як вынік, нізкі атрымліваемы эканамічны эфект, аб чым справядліва было заўважана на сходзе партыйнага актыву універсітэта.

Чым растлумачыць, што навуковы калектыў, які мае высокакваліфікаваныя кадры і доказвае здольнасць паспяхова рашаць сур'ёзныя навуковыя задачы, да цяперашняга часу не ўнёс дастаткова значнага ўкладу ў важную і адказную справу ўкаранення вынікаў даследаванняў у народную гаспадарку? Гэта пытанне неаднаразова абмяркоўвалася на партыйных і прафсаюзных сходах інстытута, яму было прысвечана пасяджэнне савета НДІ ФХП і хімічнага факультэта, на якім са справядлівай

МЫ — ІНТЭРНАЦЫЯНАЛІСТЫ

# «МНЕ ПАДАБАЮЦЦА САВЕЦКІЯ ЛЮДЗІ»

ДВА ГАДЫ НАЗАД я прыехаў у Савецкі Саюз, каб навучыцца майстэрству журналіста, па-сапраўднаму авалодаць асновамі гэтай прафесіі.

У сябе на радзіме я заўсёды цікавіўся жыццём вялікай сацыялістычнай краіны, пастаянна чытаў газету «Маскоўскія навіны» на арабскай мове.

Калі я нарэшце прыехаў у СССР і пачаў вучыцца ў Маскве, я зусім не ведаў рускай мовы. Але гэта не перашкодзіла мне даведацца аб тым, што Масква — адзін з самых вялікіх гарадоў свету, што ў ім жыве шмат людзей розных нацыянальнасцей. Прадстаўнікі розных краін займаюцца ў навучальных установах савецкай сталіцы.

Мой йеменскі сябар вучыцца ў Маскве ў аспірантуры. Ён шмат расказваў мне аб гісторыі горада, яго помніках. Нам вельмі спадабаўся цэнтр Масквы. Адразу ж мы наведалі Маўзалей У. І. Леніна. Мяне ўразіла вялікая колькасць людзей, якія ішлі аддаць даніну павагі правадыру. Сярод іх было шмат замежных грамадзян.

Потым мы наведалі музей У. І. Леніна, былі ў Вялікім тэатры. Вельмі спадабаліся Ленінскія горы, МДУ, уразіла хараство Маскоўскага метро.

У Маскве я пазнаёміўся з працавітымі савецкімі людзьмі. Яны вельмі любяць дзяцей. А дзеці — будучыня краіны.

Я яшчэ раз пераканаўся ў тым, што савецкія людзі жадаюць міру і дружбы на ўсёй планеце.

**Касім УСАЧЫ,**
**студэнт II курса факультэта журналістыкі.**



НА ЗДЫМКУ: студэнткі хімфака ў час лабараторных работ. Фота М. БЯСЦВІЦКАГА.

# НА БУДУЧЫНЮ

крытыкай і шэрагам канструктыўных прапаноў выступіў рэктар універсітэта акадэмік АН БССР У. А. Белы. Прычына, відаць, заключаецца, па-першае, у тым, што да стварэння інстытута на хімічным факультэце была характэрна сітуацыя, калі вялікая колькасць разнапланавых тэм выконвалася дробнымі калектывамі даследчыкаў, раз'яднаных па кафедрах. Другой прычынай з'яўляецца «традыцыя» многіх навуковых калектываў універсітэта, якія на працягу дзесяцігоддзяў рабілі націск на атрыманне фундаментальных вынікаў і мала ўвагі ўдзялялі рашэнню, а тым больш укараненню ў практыку вынікаў прыкладных работ.

З моманту арганізацыі НДІ ФХП узяты курс на пераадоленне гэтых «традыцый», на інтэнсіфікацыю ўсяго навукова-вытворчага цыкла выканання НДР і ўкаранення іх вынікаў.

Сур'ёзнай перашкодай у гэтай справе з'яўляецца адсутнасць у інстытуце вопытна-эксперыментальнай базы для правядзення канструктарскіх распрацовак і праверкі іх вынікаў. Аднак намі ўстаноўлены, умацоўваюцца і пашыраюцца сувязі з галіновымі вопытна-канструктарскімі і праектнымі ўстановамі, сумесна з якімі ўжо пачаты распрацоўкі па выніках асноўных напрамкаў навуковай дзейнасці інстытута. Гэтыя работы, як правіла, вядуцца з выкарыстаннем праграмна-мэтавага метаду планавання. **НДІ ФХП удзельнічае ў распрацоўцы 4 агульнасаюзных і 3 рэспубліканскіх комплексных праграм. У XI пяцігодцы колькасць комплексна-мэтавых праграм, у выкананні якіх будзе прымаць удзел інстытут, падвоіцца.**

У 1979—1980 гг. на зацікаўленых прадпрыемствах паспяхова праведзены вопытныя і вопытна-прамысловыя праверкі трох распрацовак інстытута, выкананых у рамках асноўных навуковых напрамкаў. На аснове вынікаў гэтых праверак і ў адпаведнасці з планам сумесных работ у XI пяцігодцы намечана распрацаваць і здзейсніць шырокае ўкараненне ў галіны хімічнай прамысловасці найбольш буйных распрацовак інстытута.

Сумесна з іншымі НДІ будуць распрацаваны і ўкаранёны новыя тэхналогіі атрымання гідратцэлюлозных валокнаў, а таксама сінтэтычных валокнаў, мадыфіцыраваных цэлюлозай. Гэтыя тэхналогіі дазволяць істотна спрасціць працэс вырабу валокнаў, рашыць сур'ёзныя задачы, звязаныя з аховай навакольнага асяроддзя пры перапрацоўцы цэлюлозы, атрымаць валокны з палепшанымі фізіка-механічнымі і гігіенічнымі ўласцівасцямі. Сумесна з галіновымі інстытутамі будуць укаранёны новыя тыпы фатаграфічных і рэнтгенаўскіх тэхнічных плёнак, якія змяшчаюць у 20—40 разоў менш вострадэфіцытнага серабра, чым у існуючых аналагах, і характарызуюцца палепшанымі эксплуатацыйнымі якасцямі.

**Ужо ў 1982—1984 гадах інстытут разлічвае атрымаць эканамічны эфект ад укаранення названых распрацовак у памеры 2—3 мільёнаў рублёў у год.**

Вялікую ўвагу інстытут удзяляе ўмацаванню і расшырэнню творчых сувязей з навукова-даследчымі ўстановамі і прамысловымі прадпрыемствамі рэспублікі. Заключаны дагаворы аб навукова-тэхнічным супрацоўніцтве з 13 арганізацыямі і прадпрыемствамі БССР.

Побач з выкананнем навуковых даследаванняў, павышэннем іх эфектыўнасці адной з важных задач сваёй дзейнасці калектыў інстытута лічыць актыўны ўдзел у вучэбна-выхаваўчай рабоце са студэнтамі. З першых дзён існавання НДІ ФХП наладжана цеснае ўзаемадзеянне з хімічным факультэтам як у галіне вучэбна-выхаваўчай работы, так і ў галіне навуковых даследаванняў. Ужо зараз можна з упэўненасцю лічыць, што такое супрацоўніцтва вельмі карысна як для факультэта, так і для інстытута. Шырокае прыцягненне студэнтаў да НДР інстытута забяспечвае магчымасць пастаноўкі вялікай колькасці пошукавых работ, а ўдзел у НДР высокакваліфікаванага прафесарска-выкладчыцкага саставу кафедр дазваляе выконваць навукова-даследчыя работы па тэматыцы інстытута на высокім навуковым узроўні. Акрамя таго, удзел супрацоўнікаў інстытута у вучэбным працэсе, іх цесны кантакт са студэнтамі дазваляе загадзя падабраць найбольш здольных студэнтаў для папаўнення штатаў лабараторый НДІ.

Інстытутам рошаны і паспяхова рашаюцца многія праблемы. Вялікае кола задач, накіраваных на павышэнне эфектыўнасці навуковых даследаванняў, нам яшчэ прадстаіць рашыць. Калектыў інстытута добра разумее важнасць гэтых задач і, рыхтуючыся да дастойнай сустрэчы XXVI з'езда КПСС, прыкладзе ўсе сілы, веды і вопыт для іх паспяховага рашэння.

**В. СВІРЫДАУ,**
**дырэктар НДІ ФХП, член-карэспандэнт АН БССР.**

СПРАВАЗДАЧЫ І ВЫБАРЫ Ў ПРАФСАЮЗАХ

# «На падводных КРЫЛАХ»

КАНФЕРЭНЦЫЯ ІШЛА ГЛАДКА І РОЎНА — як глісер на падводных крылах. Даводзілася вам ездзіць на ім? Цёпла, ціха, на хвалях не гойдае — можна нават забыцца, што пад табой глыбіня ў некалькі дзесяткаў метраў. Але гэтая глыбіня ёсць. І зусім не так да яе далёка...

Чаму такі пачатак? Таму, што некаторыя прафсаюзныя актывісты праходзяць шлях ад адной справаздачна-выбарнай канферэнцыі да другой, нібы на падводных крылах — недалёка ад паверхні. Закранаюцца толькі вяршкі праблем. Карэнні ж хаваюцца глыбей — да іх нават не даходзяць кругі, узнятыя на паверхні. Такія думкі міжволі прыходзілі ў час прафсаюзнай справаздачна-выбарнай канферэнцыі ФПМ.

Трэба аддаць належнае арганізатарам канферэнцыі: прайшла яна сапраўды ўрачыста. Вялікая, прыгожая зала, сучасная музыка ў фае ў час перапынкаў. Усё гэта адразу стварала добры, прыўзняты настрой. Варта падкрэсліць, што пасля канферэнцыі адбыўся спектакль народнага тэатра Палаца культуры Белсаўпрофа, арганізавана была дыскатэка...

Дарэчы, хто сказаў, што словы «падводныя крылы» трэба аднесці да работы ўсяго прафбюро і спортбюро ФПМ? Не, і яшчэ раз не. Возьмем, напрыклад, спартыўна-аздараўленчую работу. Амаль ніякіх наракання. У мінулым годзе ФПМ заняў другое месца на спартакіядзе БДУ. А год назад было чацвёртае. Трыста сорак шэсць чалавек удзельнічала ў турысцкіх паходах, выйшлі ў свет 10 фотагазет...

Энергічнай пастаноўцы спартыўна-масавай работы садзейнічала, перш за ўсё, ініцыятыўнасць старшыні спортбюро Ларысы Манжуры.

Ні ў якім выпадку нельга сказаць, што нічога не рабіла, напрыклад, адна з галоўных камісій прафбюро — вучэбна-вытворчая. Рэгулярна праводзіліся праверкі наведвання заняткаў студэнтамі, вёўся экран ходу сесіі. На факультэце арганізавана сацыялістычнае спаборніцтва на лепшую акадэмічную групу. Ды і ў параўнанні з мінулым годам паспяховасць на ФПМ павысілася на 1,26 працэнта. Гэтыя факты сведчаць аб тым, што вядзецца пэўная работа. Але... Ці не здаецца такая «пэўная работа» тым жа плаваннем на паверхні? Ці не спрабуем мы вырасціць кветку, паліваючы не корань, а пырскаючы на бутон? Ці не робім дах раней за падмурак?

Вось як мяркуюць студэнткі IV курса 8-й групы Т. Рэўчук, Н. Казялецкая, Л. Славуціч: «Першакурснікі былі б больш заахвочаны вучобай, калі б яны больш ведалі аб сваёй прафесіі. Трэба рабіць для іх экскурсіі на прадпрыемствы, дзе выкарыстоўваецца вылічальная тэхніка, даваць студэнтам больш самастойнасці...» Думка не бясспрэчная, але цікавая.

Або возмем такі бок работы вучэбна-вытворчай камісіі, як арганізацыя сацыялістычнага спаборніцтва. Ці ўсё зроблена для таго, каб сацыялістычнае спаборніцтва стала сапраўдным рухавіком факультэцкага жыцця? Слова студэнтам. І. Пучко, IV крус, 3-я група: «Трэба, каб у пачатку вучэбнага года ў кожнай групе аб'яўляліся крытэрыі ацэнкі сацыялістычнага спаборніцтва. Тады група бачыла б перад сабой мэту. А імкненне дасягнуць яе з'яднала б людзей».

С. Навагран, IV курс, 1-я група: «На працягу ўсяго года мы не ведаем, як праходзіць спаборніцтва. Неабходна, на маю думку, стварыць экран спаборніцтва і падводзіць вынікі кожны месяц».

Напэўна, зрабіць гэта не так цяжка. Трэба толькі падыходзіць да справы не фармальна, не ісці слепа па выбітых сцежках. Не спрачаюся, праверка наведвання — неабходная справа, але і яе можна давесці да абсурда, калі брацца бяздумна. Ці правільна робяць прафбюро і камітэт камсамола ФПМ, калі праводзяць такія праверкі паасобку, дубліруючы адзін аднаго? Гэта недапушчальна раскошная трата сіл і часу як прафсаюзных, так і камсамольскіх актывістаў.

Работа ні адной камісіі не выклікала столькі размоў і спрэчак, як дзейнасць жыллёва-бытавой камісіі. Тая ж Іра Пучко гаворыць: «Чамусьці ў гэтым годзе атрымалася так, што тым, хто прыехаў пазней, зусім не дасталося месц у інтэрнаце...»

Выклікаюць нараканні ў студэнтаў і начныя дзяжурствы на паверхах, і прапускная сістэма, і графік работы душа, і многае іншае. Усе чакалі, што на канферэнцыі выступіць старшыня студсавета А. Сатолін, але ён адсутнічаў...

Член студсавета В. Ліпай гаворыць, што прафбюро не аказвала студсавету амаль ніякай дапамогі. Хіба толькі зрэдку выдаткоўвала грошы для культурных мерапрыемстваў. Ці нармальнае гэта становішча, калі паміж студсаветам і прафбюро няма добрых кантактаў, калі замест таго, каб працаваць разам, яны скардзяцца адзін на аднаго: «Суботнік праводзілі мы, а яны «прысвоілі» яго сабе...»

Вам ніколі не прыходзіла думка, што багацце мовы — вельмі зручная рэч пры складанні справаздач? Ці не праўда, салідна гучыць: «праводзіліся праверкі ўмоў быту студэнтаў, якія пражываюць на прыватных кватэрах...» Гэта цытата з даклада. Студэнтка Іра Дабжынецкая не збіралася выступаць, але даклад старшыні прафбюро В. Нічыпарука прымусіў яе папрасіць слова: «Вы кажаце — «праводзіліся праверкі...» Я не ведаю, можа і праводзіліся — у двух-трох чалавек. Але ў інтэрнаце не жывуць 37 працэнтаў студэнтаў! 37 працэнтаў — гэта не два-тры чалавекі. Хто можа адказаць мне, дзе і як жывуць гэтыя людзі, калі нават не ва ўсіх вядомы адрасы?» На яе пытанне, на жаль, адказу не прагучала. Як гаворыцца, каментарыі не патрэбны.

На канферэнцыі мы размаўлялі з многімі студэнтамі—featured рознага ўзросту, рознага погляду на работу прафбюро. Яны сыходзіліся ў адным: памылкі, якія допусціла кіраўніцтва прафсаюзнай арганізацыі, можна ў многім растлумачыць тым, што састаў прафбюро амаль не прыслухоўваўся да парад тых, хто займаецца прафсаюзнай работай ужо шмат гадоў. Памылковай была і пазіцыя старшыні — ён імкнуўся ўсё зрабіць сам, часта падмяняў работу калектыўных камісій.

Прайшлі спрэчкі, зачытана пастанова канферэнцыі, выбраны новы састаў прафбюро... Думаецца, прафсаюзныя актывісты добра ўзважаць усе праблемы, аб якіх гаварылася, і ў прафбюро не атрымаецца новага «плавання на паверхні».

**В. ЕФІМЕНКА,**
**М. ЛАХВІЧ.**
**(Прэс-цэнтр прафкома).**



# ЛІДЭР МЯНЯЕЦЦА

**КАМЕНТАРЫЙ ДА ВЫНІКАЎ АГУЛЬНАЎНІВЕРСІТЭЦКАГА ЛЁГКААТЛЕТЫЧНАГА КРОСУ НА ПРЫЗ ГАЗЕТЫ «БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ»**

НАДВОР'Е НЕ РАДАВАЛА. Нават больш. Яно было дрэнным — пранізлівы восеньскі вецер, бясконцыя шэрыя хмары. Але гэта не псавала настрой нікому. Ні ўдзельнікам спаборніцтваў, ні яго арганізатарам. Хто прыйшоў у гэтую нядзельную раніцу на стадыён БДУ імя У. І. Леніна, каб пахварэць за сваю каманду, за свой родны факультэт, не пашкадаваў. Бо традыцыйны агульнауніверсітэцкі лёгкаатлетычны крос—падзея заўсёды цікавая і святочная, масавая. Падзея, якая збірае вялікую колькасць аматараў гэтага віду спорту. І сённяшні крос не быў выключэннем. У ім прыняло ўдзел каля паўтары тысячы студэнтаў. Паказаны добрыя вынікі і, безумоўна, адкрыты новыя прозвішчы пераможцаў.

Сярод мужчын на кіламетровай дыстанцыі пераможцам стаў першакурснік механіка-матэматычнага факультэта Пётр Курыжка — 2 мінуты 42 секунды. Другое і трэцяе месцы адпаведна занялі яго сябры па камандзе Сяргей Бабровіч (2 мінуты 43 секунды) і Артур Віленскі (2 мінуты 45 секунд).

У жанчын на дыстанцыі 500 метраў мацнейшымі былі першакурсніца філалагічнага факультэта Наталля Бяжок і Ала Крупянкова (мехмат). З вынікам 1 мінута 27 секунд дзяўчаты падзялілі першае і другое месцы. Трэцяй была прызёр мінулагодняга кросу студэнтка факультэта прыкладной матэматыкі Вольга Склярава.



Прыемна тое, што як у жанчын, так і ў мужчын у асабістым першынстве пераможцамі сталі першакурснікі. Гэта сведчыць аб пэўным спартыўным патэнцыяле новага папаўнення. І можна спадзявацца, што ў хуткім часе рэкорды універсітэта па дзвюх асноўных кросавых дыстанцыях (1000 метраў — мужчыны, 500 метраў— жанчыны) значна палепшацца.

А зараз аб тым, як размеркаваліся месцы сярод факультэтаў, адпаведна агульнакамандным вынікам (у дужках — колькасць набраных ачкоў).

| | |
|---|---|
| **1. Факультэт журналістыкі** | **[86,7]** |
| **2. ФПМ** | **[84,8]** |
| **3. Фізічны** | **[84,1]** |
| **4. Механіка-матэматычны** | **[83,7]** |
| **5. Філалагічны** | **[81,8]** |
| **6. Біялагічны** | **[81,0]** |
| **7. Радыёфізічны** | **[78,3]** |
| **8. Юрыдычны** | **[77,6]** |
| **9. Гістарычны** | **[74,9]** |
| **10. Хімічны** | **[74,6]** |
| **11. Геаграфічны** | **[73,9]** |

Як бачна, табліцу мацнейшых узначальвае факультэт журналістыкі. Гэта сапраўдная сенсацыя. Бо ў мінулым годзе журналісты выступілі вельмі дрэнна — былі апошнімі, адзінаццатымі. У чым жа сакрэт іх поспеху? Расказвае выкладчык кафедры фізічнага выхавання **У. А. ТУРЫГІН:**

**— Зборная кросавая каманда факультэта журналістыкі, на якім я адказваю за фізічнае выхаванне, упершыню за даволі працяглы час стала лідэрам. Вынікі ў спорце, як вядома, хутка мяняюцца. Сёння ты першы, а заўтра не ўваходзіш нават у прызёры. Але ў такіх масавых спаборніцтвах, як крос, спартыўнае шчасце, на маю думку, спадарожнічае добра згуртаваным калектывам, кожны член якога паказвае стабільныя рэзультаты і, безумоўна, хварэе за агульную справу. І калі вы бачылі забегі нашых журфакаўскіх мужчынскіх і жаночых каманд, то, напэўна, прыкмецілі іх фініш. Кампактны, без расцягвання ў доўгі ланцуг. Яны мелі добрую, гаворачы мовай стралкоў, «кучнасць», разрыў паміж першым і апошнім спартсменам быў мінімальным. А ўвогуле — выйгрыш часу для ўсёй каманды.**

Добра выступілі на кросе таксама каманды факультэта прыкладной матэматыкі (у мінулым годзе толькі 9-е месца), механіка-матэматычнага факультэта, фізфака (мінулагодняя пераможцы кросу). Біялагічны факультэт, які заўсёды быў у тройцы лепшых, крыху здаў свае пазіцыі. Дарэчы, у адрас біёлагаў былі нараканні ад арганізацыйнага камітэта спаборніцтваў. Затое географы выступілі сёлета значна ніжэй сваіх магчымасцей — 11-е месца. Сюрпрызам кросу стала 9-е месца гісторыкаў, чые спартыўныя дасягненні агульнавядомы і прызнаны. Прычына— малая колькасць удзельнікаў, якія былі выстаўлены на спаборніцтвы. Напомнім, што асноўныя мужчынскія і жаночыя каманды кожнага факультэта па сваёй заліковай колькасці павінны складаць 10 працэнтаў ад усёй колькасці студэнтаў факультэта. Дазваляецца таксама мець запасную каманду. Гісторыкі ж нават не дабралі 7 чалавек у асноўны састаў. Такое ж становішча было і ў каманды юрыдычнага і хімічнага факультэтаў.

**Другі год запар рэдакцыя газеты «Беларускі універсітэт» устанаўлівае спецыяльны прыз для каманды-пераможцы сярод першых курсаў. Першакурснікі-журналісты таксама перамаглі, другое месца ў першага курса гістарычнага факультэта. Трэцяе месца юрыстаў-першакурснікаў — вялікі поспех. І гэтым яны, безумоўна, абавязаны той арганізацыйнай рабоце, якую правялі на факультэце выкладчык кафедры фізічнага выхавання Э. В. Тарноўскі і старшыня спартыўнага клуба факультэта чацвёртакурснік Уладзімір Лукашэвіч. У асабістым заліку сярод першакурснікаў вызначыліся студэнт хімічнага факультэта Аляксей Чарняхоўскі — 2 мінуты 48 секунд і Ганна Лебядзевіч (ФПМ) —1 мінута 33 секунды.**

**С. ЛЫСКАВЕЦ,**
**наш кар.**
Фота **А. Стадуба.**

**● ЯК ЖЫВЕШ, ПЕРШАКУРСНІК!**

# ДЗВЕ ГАДЗІНЫ ПРАКТЫЧНЫХ

— ЯК НАСТРОЙ перад практычнымі? — пытаюся ў старасты групы.

— Цудоўны! —адказвае той і ўзнімае ўгару вялікі палец.— Не такі страшны воўк...

— У гэты момант у аўдыторыю заходзіць выкладчык, жарты і смех разам сціхаюць.

Так пачалося мае знаёмства з другой групай першага курса юрыдычнага факультэта. Пачалося на першых у іх жыцці практычных занятках па палітычнай эканоміі капіталізму.

**АДСТУПЛЕННЕ ПЕРШАЕ. Успамінаю, як два гады таму назад стаў студэнтам. Усё было цікавым і незвычайным: і першая «бульба», і лекцыі, і розныя «ўводзіны» ў спецыяльнасць. Але сапраўднае студэнцкае жыццё пачалося крыху пазней, праз якія-небудзь дватры тыдні, калі неабходна было рыхтавацца да практычных заняткаў, абклаўшыся падручнікамі і канспектамі. Якіх, на маё здзіўленне,— цэлая гара. Як тут не спалохацца!**

З апошняй парты я не бачу іх твараў, але адчуваю: хвалююцца. Ірына Шынкевіч нахілілася над падручнікамі. Мабыць, каторы ўжо раз паўтарае пытанні. Больш спакойна, як і належыць дужай палавіне, трымаюцца юнакі. Але нават і яны не-не ды зазірнуць у канспект.

— Сёння на практычных занятках пазнаёмімся з прадметам і метадам палітычнай эканоміі, — гаворыць выкладчык Анатоль Уладзіміравіч Каваленка.— У каго ёсць пытанні?

І тут пачалося. Ці можна пры адказах карыстацца канспектамі? Хто будзе прымаць залік? Ці можна атрымаць залік аўтаматычна? Што для гэтага патрэбна? І многае іншае. Аднак асаблівую рэакцыю ў першакурснікаў выклікае той факт, што патрэбна вывучаць «Капітал». А гэта больш чым 1100 старонак!

І толькі тады ўляглiся страсці, што кіпелі вакол «Капітала», калі адказваць пачала Людміла Стэльмах. Здагадваюся, што Люда — учарашняя школьніца. Але гаворыць упэўнена, граматна, без збояў. Цытуе Маркса, Энгельса, Леніна. Па твары Анатоля Уладзіміравіча бачу, што ён задаволены адказам.

Гэтак жа добра адказваюць Мікалай Чарныш, Людміла Боханава, Георгій Дулько.

Пасля званка падыходжу да Люды Стэльмах.

— Ці задаволена ты сваім адказам?

— Калі па-шчырасці — дык не вельмі. Нешта ўпусціла. Магчыма, таму, што крыху хвалявалася. Як-ніяк першыя практычныя...

А калі параўнаць іх са школьнымі ўрокамі?

— Ніякага падабенства. У ВНУ ўся праграма разлічана на сур'ёзнае, самастойнае вывучэнне. Для мяне універсітэт —першы крок у будучую спецыяльнасць. Адкрываю сваю запаветную мару: хачу быць інспектарам дзіцячага пакоя міліцыі, працаваць з падлеткамі.

**АДСТУПЛЕННЕ ДРУГОЕ. Сённяшні першакурснік — эрудзіраваны, начытаны. На жаль, дзвюх гадзін вельмі мала, каб паказаць цэлую групу. Бо яна— складаны і часам супярэчлівы арганізм. Але ў адным я ўпэўнены: супярэчнасці патрэбна вырашаць. Вырашэнне супярэчнасцей — крок наперад.**

**А. ЛАЗОЎСКІ.**

## АБ'ЯВА

**Пры мясцовым камітэце універсітэта дзейнічае грамадская юрыдычная кансультацыя.**

**Кансультацыі па прававых пытаннях (юрыдычныя даведкі, тлумачэнні заканадаўства па ўсіх галінах) праводзяцца кожны першы аўторак месяца з 15 да 17 гадзін.**

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.
6 лістапада 1980 г.

АТ 15480 Заказ 1661

220080 МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 14.
ТЭЛЕФОН 22-07-19

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЁЎ